ГЭТЫ НУМАР
НАШАЙ ГАЗЕТЫ
РАСКАЗВАЕ
АБ ФАКУЛЬТЭЦЕ
ФІЗІЧНАГА
ВЫХАВАННЯ

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Год выдання другі
№ 13 (71)
СУБОТА
10
КРАСАВІКА
1971 года

Цана 2 кап.



**Сталіца нашай Радзімы — Масква. У Крамлёўскім Палацы з'ездаў плённа працуе чарговы XXIV з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.**

**З вялікім хваляваннем і выключнай увагай сочаць за работай форуму камуністаў Савецкага Саюза працоўныя нашай краіны і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.**

**Матэрыялы і дакументы з'езда вывучаюцца і студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. У гэтыя дні ў кабінетах, чытальных залах і бібліятэцы можна сустрэць многіх юнакоў і дзяўчат, якія чытаюць свежыя газеты, канспектуюць Справаздачны даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС Леаніда Ільіча Брэжнева, вывучаюць выступленні дэлегатаў, рыхтуюцца да гутарак па матэрыялах з'езда.**

**НА ГЭТЫМ ЗДЫМКУ наш фотакарэспандэнт зазняў групу студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта, якія вывучаюць дакументы з'езда.**

## РАШАЮЧЫ ВАЖНЫЯ ЗАДАЧЫ

ПАСТАНОВАЙ Савета Міністраў БССР у 1949 годзе ў складзе Гомельскага педінстытута быў арганізаваны факультэт фізічнага выхавання. Яго адкрыццё з'явілася вялікай падзеяй не толькі ў спартыўным жыцці вобласці, але і рэспублікі. Школы, вну і сярэднія спецыяльныя ўстановы адчувалі недахоп у спецыялістах фізічнай культуры. Дастаткова сказаць, што ў Гомельскай вобласці ў 1950 годзе было толькі 25 спецыялістаў з вышэйшай фізкультурнай адукацыяй.

Прайшло больш 20 год. За гэты час факультэт фізвыхавання падрыхтаваў звыш 500 спецыялістаў фізічнай культуры.

Зараз на факультэце функцыяніруюць кафедры спартыўных гульняў, лёгкай атлетыкі, лыжнага спорту, тэорыі і практыкі фізічнага выхавання, фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны. Большасць супрацоўнікаў кафедр з'яўляюцца нашымі выпускнікамі. Работу са студэнтамі праводзяць адзін доктар біялагічных навук, прафесар, шэсць кандыдатаў навук, адзін чэмпіён алімпійскіх гульняў, майстры спорту, «Выдатнікі фізічнай культуры», заслужаныя трэнеры рэспублікі.

Вялікая работа праведзена па стварэнню спартыўнай базы. Сіламі студэнтаў першага набору пабудаваны і ўведзены ў эксплуатацыю чатыры баскетбольныя і дзве валейбольныя пляцоўкі, лыжная база, спартыўная зала. Усё гэта дапамагло павысіць якасць вучэбнага працэсу.

За прайшоўшыя гады значна вырасла матэрыяльная база факультэта. Сёння мы праводзім заняткі ў сучаснай спартыўнай зале. У распараджэнні студэнтаў лыжная станцыя на 500 пар лыж з тэхнічным абсталяваннем, стацыянарны зал цяжкай атлетыкі.

У падрыхтоўцы кваліфікаваных настаўніцкіх кадраў важнае значэнне мае спартыўная кваліфікацыя студэнтаў. Доўгі час нарматывы майстра спорту СССР былі недасягальнымі для нашых выхаванцаў. Першымі дабіліся гэтага ганаровага звання ў 1956 годзе М. Траскуноў і А. Маркаўцоў. За апошнія ж дзесяць гадоў падрыхтавана звыш ста майстроў спорту, 50 кандыдатаў у майстры спорту, 500 першаразраднікаў, тысячы спартсменаў масавых разрадаў, інструктараў і суддзяў па асобных відах спорту. Сярод выхаванцаў факультэта заслужаны майстар спорту, алімпійскі чэмпіён Леанід Гейштар, чэмпіён і рэкардсмен краіны Уладзіслаў Сапея, чэмпіёны і прызёры першынстваў краіны і міжнародных спаборніцтваў Дзмітрый Панькоў, Уладзімір Паўлючкоў, Віктар Курачкін і многія іншыя.

Спартсмены факультэта паспяхова выступаюць у абласных рэспубліканскіх, усесаюзных і міжнародных спаборніцтвах. Сёлета хакеісты ГДУ сталі трэцімі прызёрамі чэмпіяната рэспублікі, а гандбалісты з'яўляюцца мацнейшымі ў Беларусі. У студэнцкіх чэмпіянатах добра зарэкамендавалі сябе плыўцы, весляры, гімнасты, лыжнікі, фехтавальшчыкі і прадстаўнікі іншых відаў спорту.

Вялікую работу праводзіць факультэт па прапагандзе фізічнай культуры. У нас арганізоўваюцца спартыўныя вечары, паказальныя выступленні. Кожнае лета студэнты факультэта прымаюць удзел у вучэбных лагерных зборах. Тут яны не толькі адпачываюць, але і праводзяць трэніровачныя заняткі. Актыўны ўдзел у спартыўным жыцці прымаюць выкладчыкі факультэта В. І. Селіванаў, І. П. Волкаў, М. П. Талстапятаў, С. М. Дзегцяроў, В. К. Кірэеў, Я. Т. Церашкавец, В. М. Макарэвіч, А. П. Борсук. Яны ўдзельнікі многіх буйных рэспубліканскіх і ўсесаюзных спаборніцтваў.

На факультэце сістэматычна паляпшаецца якасць вучэбнага працэсу. Нашы выкладчыкі вывучаюць вопыт сваіх калег у іншых вну краіны, удзельнічаюць у тэарэтычных семінарах, рыхтуюцца да здачы кандыдацкіх экзаменаў.

Асноўнымі праблемамі факультэта з'яўляюцца распрацоўка метадычных пытанняў і метадалагічных даследаванняў, фізіялагічных праблем, якія датычаць плавання, спартыўных гульняў, лёгкай атлетыкі, а таксама гісторыі развіцця спорту ў Гомельскай вобласці. Па пытаннях методыкі фізічнага выхавання выкладчыкі факультэта апублікавалі больш 50 прац. Пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры лыжнага спорту кандыдата біялагічных навук І. П. Волкава выконваюцца студэнцкія навуковыя работы па тэматыцы «Удасканаленне методыкі трэніроўкі». Цікавыя тэмы распрацоўваюцца студэнтамі, якія спецыялізуюцца на кафедрах спартыўных гульняў і тэорыі і методыкі фізічнага выхавання.

Навуковай работай студэнтаў кіруюць кваліфікаваныя дацэнты і старшыя выкладчыкі, якія валодаюць вялікім практычным вопытам.

Мы клапоцімся аб падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадрах на кафедрах факультэта. На працягу двух-трох год маладыя спецыялісты працуюць асістэнтамі або выкладчыкамі кафедр. За гэты час яны здаюць кандыдацкія экзамены па замежнай мове і марксісцка-ленінскай філасофіі, праходзяць стажыроўку. Маладыя даследчыкі атрымліваюць тэмы для кандыдацкіх дысертацый і распрацоўваюць іх.

Факультэт фізічнага выхавання з'яўляецца старэйшым у вышэйшых навучальных установах рэспублікі. Ён рыхтуе высокакваліфікаваных педагогаў для школ, трэнераў. Мы нястомна праводзім вялікую работу, накіраваную на паляпшэнне сістэмы фізічнага выхавання ў нашай краіне.

**А. СЯМІКОП,**
**дэкан факультэта фізічнага выхавання, кандыдат педагагічных навук.**

## ВУЧОНЫЯ НА ПРАДПРЫЕМСТВЕ

У Справаздачным дакладзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Леаніда Ільіча Брэжнева ўказваецца на тое, каб яшчэ цясней зблізіць навуку, пошукі і даследаванні вучоных з вытворчасцю.

Адным з яркіх сведчанняў разумення гэтай складанай задачы з'явілася сустрэча выкладчыкаў, членаў партыйнай арганізацыі эканамічнага факультэта з рабочымі завода «Цэнтраліт». Вучоныя выступілі з тлумачэннем важнейшых палажэнняў Справаздачнага даклада ЦК КПСС, матэрыялаў і рашэнняў XXIV з'езда. Прысутныя сардэчна і цёпла сустрэлі дацэнтаў М. М. Маёрава, І. П. Трацэўскага, Л. А Цяцерыну, Д. Г. Процкую, Т. П. Трацэўскую, выкладчыкаў Д. М. Курына, Н. В. Волкаву.

Адбылася шчырая і дзелавая размова аб вялікіх здзяйсненнях савецкага народа, аб рэальных перспектывах, якія намечаны Камуністычнай партыяй на далейшае паляпшэнне дабрабыту працоўных, рост прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці.

Рабочыя задалі шматлікія пытанні, на якія атрымалі вычарпальныя і грунтоўныя адказы.

**Д. КУРЫН,**
**сакратар партарганізацыі эканамічнага факультэта.**

